# З ЗАМЕЖНЫМІ ПЕДАГОГАМІ

Людміла СТАРАДУМАВА

Студэнты кафедры тэатральнай творчасці Беларускага універсітэта культуры апошнім часам атрымалі магчымасць паглядзець работу майстроў сцэны, займацца з прафесійнымі акцёрамі, быць удзельнікамі заняткаў, якія праводзяць лепшыя педагогі па сцэнічнай мове і сцэнічным руху.

У лістападзе 1995 года на сцэне Маладзёжнага тэатра Беларусі іспанскі педагог Хуан Карлас на працягу сямі дзён займаўся з маладымі акцёрамі і студэнтамі кафедры тэатральнай творчасці.

Заўсёды цікавая сустрэча з чалавекам, тым больш творчым, пра якога расказвалі, які ў тваім уяўленні асоба значная. Ці такі ён на самай справе? Ці не расчаруешся пры сустрэчы? Хуан Карлас апраўдаў нашы спадзяванні і пацвердзіў наша ўяўленне пра яго.

Успамінаючы заняткі, якія праводзіў Хуан Карлас, міжволі губляешся: з чаго пачаць? З захаплення прафесійнай універсальнасцю педагога? З пакланення перад яго незвычайнай працаздольнасцю? З умення стварыць на занятках сапраўды творчую атмасферу? А яго нязменная добразычлівасць у адносінах да маладых акцёраў і студэнтаў? Рэдкая сумленнасць у праведзенні заняткаў?

І ўсё ж хочацца пачаць з таго, што Хуан Карлас таленавіты педагог, а ў таленавітай педагогікі свая прастора і свая атмасфера, свае галасы, свая музыка, свой настрой, свой боль і свая радасць... Свая школа. Хуан Карлас заразіў удзельнікаў заняткаў сваім жаданнем падзяліцца, аддаць усё, што ведае, чым валодае, што адчувае ў прадмеце, якому свята служыць.

Незвычайнае яго ўменне разняволіць, вызваліць студэнтаў і маладых акцёраў ад унутраных «заціскаў», дапамагчы даверыцца сваёй прыродзе, паверыць у тое, што цела можа быць самастойным і свабодным, не падкантрольным розуму.

Дыханне, народжанае рухам цела, пластыкай, нібы пералівaецца ў натуральнае гучанне голасу, і практыкаванні па дыханні становяцца практыкаваннямі па развіцці дыяпазону голасу. Голас нараджаўся дзякуючы рухам цела, ён адпавядаў ім, быў натуральным працягам, гукавым адлюстраваннем гэтых рухаў. І гэтае спалучэнне практыкаванняў па развіцці дыяпазону голасу з пластыкай, іх узаемапранікненне, іх узаемасувязь нам уяўляюцца найбольш цікавымі і важнымі ў методыцы іспанскага педагога.

Хуан Карлас надзелены «пачуццём тэатра», якое можа мець, а можа і не мець самы найлепшы педагог. І таму для яго заняткі па сцэнічнай мове і па сцэнічным руху па сваёй прыродзе, як і тэатр,— ігра. Ён здолеў знайсці з удзельнікамі заняткаў асаблівы кантакт, які абудзіў у іх імправізацыйнае самаадчуванне пошуку — адзіна магчымае ў дадзеных абставінах заняткаў — ігры. Акрамя таго, Хуан Карлас валодае педагагічным дарам. Ён шчодры на пахвалу вучням і вынаходлівы ў гэтай пахвале. Ён дапамог тым, хто прысутнічаў на занятках, спасцігнуць навуку тэатральнай педагогікі. І ёсць надзея, што настаўнік абудзіў у душах сваіх вучняў прагу вечнага вучнёўства.